Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт музычнага мастацтва

Кафедра мастацтва эстрады

УЗГОДНЕНА
В. а. заг. кафедры

______________Т.Н. Дробышава
«___»_______________2017 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

______________І.М. Грамовіч
«___»______________2017 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ВЫВУЧЭННЕ АРКЕСТРАВАГА РЭПЕРТУАРА

для спецыяльнасці
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
напрамак спецыяльнасці
*1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*

Складальнікі: *Белова М.В., дацэнт; Горын С.Г., ст .выкладчык*

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета універсітэта 21.11. 2017 г.
пратакол № 3

Складальнікі:

*Белова М.В.,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»
*Горын С.Г.,*старшы выкладчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

Рэцэнзенты:

*Кафедра* драўляных духавых інструментаў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”;

*Фёдараў А.У.,* дацэнт кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь.

Разгледжан і рэкамендаван да зацвярджэння:

*Кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 05.10.2017 г.);
*Саветам* факультэта музычнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 30.10.2017 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 6
2.1 Змест аўдыторнай работы студэнтаў: тэарэтычная частка 6
2.2 Вучэбныя пасобія 8
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 9
4. 3.1 Змест аўдыторнай работы студэнтаў: практычная частка 9
3.2 Тэматыка практычных заняткаў для студэнтаў дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі (струнна-смычковыя інструменты) 10
3.3 Тэматыка практычных заняткаў для студэнтаў дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі (аркестравыя духавыя, ударныя інструменты, інструменты рытм-секцыі) 10
3.4 Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў 11
5. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ 12
4.1 Заданні для самастойнай кантраліруемай работы студэнтаў 12
4.2 Спіс твораў для вывучэння студэнтамі дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі (струнна-смычковыя інструменты) 13
4.3 Спіс твораў для вывучэння студэнтамі дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі (аркестравыя духавыя, ударныя інструменты, інструменты рытм-секцыі) 14
4.4 Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці 16
4.5 Крытэрыі адзнак вынікаў вучэбнай дзейнасці 17
6. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 20
6.1 Тыпавая вучэбная праграма 20
6.2 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: дзённая форма атрымання адукацыі 32
6.3 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: завочная форма атрымання адукацыі 33
6.4 Асноўная літаратура 34
6.5 Дадатковая літаратура 34

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Вывучэнне аркестравага рэпертуара» прызначан для навукова-метадычнага забеспячэння працэса падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках), напрамак спецыяльнасці 1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка) у адпаведнасці с патрабаваннямі Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі, зацверджанным Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26.07.2011 №167.

Мэтай выдання з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў комплекснай сістэмы ведаў, ўменняў, навыкаў у сферы музычнага выканальніцтва і педагогікі; падрыхтоўка да самастойнай, прафесійнай і музычна-асветніцкай дзейнасці; набыцце творчага вопыту, прадугледжаннымі вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці і патрабаванням адукацыйнага стандарта Рэспублікі Беларусь АСВА 1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады.

*Галоўнымі задачамі* ВМК з’яўляюцца:

– забеспячэнне павышэння якасці адукацыі ў сферы аркестравага выканальніцтва;

– вызначэнне дзідактычных сродкаў навучання для рэалізацыі адукацыйных задач, сфармуліраваных у тыпавой вучэбнай праграме па вучэбнай дысцыпліне «Вывучэнне аркестравага рэпертуара»;

– павышэнне прафесійнай кампетэнцыі і культурнага узроўня студэнтаў;

– навукова-метадычнае суправаджэнне паслядоўнага засваення студэнтамі практычных навыкаў ігры на інструменце ў аркестры.

Вучэбна-метадычны комплекс прызначаны дапамагчы выкладчыкам і студэнтам вышэйшых спецыялізаваных вучэбных устаноў у набыцці практычных, тэарэтычных ведаў у аркестравым выканальніцтве.

Сістэма навучання аркестраваму выканальніцкаму майстэрству прадугледжвае як практычныя заняткі так і самастойную работу студэнтаў. Прынцып асваення практычных навыкаў на аснове тэарэтычных ведаў дапамагае фарміраванню ў студэнтаў кампетэнцый, неабходных для вырашэння сучасных прафесійных задач.

– Структурнымі элементамі ВМК з'яўляюцца вучэбна-праграмная, вучэбна-метадычная дакументацыя, інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы. *У тэарэтычным* раздзеле разгледжваюцца змест аудыторнай работы са студэнтам, асноўныя паняцці аркестравай выканальніцкай тэхнікі на струнна-смычковых, духавых, клавішных, ударных інструментах, тэхнічныя сродкі навучання. Практычная частка аўдзіторнай работы са студэнтам, патрабаванні да музыканта-выканаўцы, метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойных заняткаў даны ў *практычным* раздзеле. Раздзел

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*кантролю ведаў* уключвае матэрыялы для назірання, ацэнкі, прагноза развіцця студэнта, заданні для самастойнай кантраліруемай работы, рэпертуарныя праграмныя патрабаванні, прыкладны спіс твораў для вывучэння, пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці. *Дапаможны* раздзел змяшчае тыпавую вучэбную праграму па вучэбнай дысцыпліне «Вывучэнне аркестравага рэпертуара», вучэбна-метадычную карту вучэбнай дысцыпліны, спіс рэкамендаванай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Змест аўдыторнай работы студэнтаў: тэарэтычная частка

Практычны курс па вучэбнай дысцыплине «Вывучэнне аркестравага рэпертуара» уяўляе сабой звяно адзінага цыкла вывучаемых музычных дысцыплін, якія ўзаемазвязаны і дапаўняюць адзін аднаго. Заняткі па дысцыпліне спалучаюць у сабе практычнае прайграванне нотнага тэкста і набыццё разнастайных ведаў, звязаных з аркестравай спецыфікай. Засваенне вучэбнага рэпертуара па дадзеным курсе прадастаўляе дадатковыя звесткі ў галіне тэорыі і гісторыі музыкі. Вывучэнне аркестравых твораў розных эпох, стыляў і жанраў дапамагае значна пашырыць музычную эрудыцыю студэнтаў і спрыяе фарміраванню іх мастацкага-эстэтычнага густу.

Заняткі па дысцыпліне базіруюцца на аснове праграмы, якая паслядоўна ставіць перад студэнтамі ўсё болей цяжкія выканальніцкія задачы (хуткі прагляд тэкста вычыма, інтанаванне ўнутраным слыхам, якасці гуказдабывання, дакладнага інтанавання, асэнсаваных штрыхоў, артыкуляцыі, і г.д.).

Для паспяховага засваення асаблівасцяў работы над аркестравым рэпертуарам, а таксама для набыцця практычных навыкаў самастойнага вывучэння матэрыяла неабходны наступныя складальнікі:

- папярэдняе валодванне асновамі ігры на інструментах;
- веды тэарэтычных асноў запісу і чытання нотных тэкстаў;
- прысутнасць ведаў аб транспаніруючых інструментах;
- веды аб неабходнасці захавання метрарытмічнай дакладнасці.

У працэсе работы над канкрэтнымі творамі трэба адзначыць асноўныя творчыя і тэхнічныя задачы, спосабы іх вырашэння. Падбор твораў праводзіцца па прынцыпу ад простага да складанага з улікам індывідуальных мастацкіх здольнасцей і тэхнічнай падрыхтоўкі кожнага студэнта. Неабходна выпрацаваць пэўныя крытэрыі адзнакі тэхнічнага майстэрства выканаўцы і падпарадкаваць ім увесь навучальны працэс.

Асноўнымі задачамі аўдыторнай работы па дысцыпліне можна лічыць:

- фарміраванне прафесійнай цікавасці да аркестравых традыцый і музыкальна-выканальніцкай культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- развіццё ўстойлівай базы навыкаў для вырашэння шырокага дыяпазону мастацкіх і тэхналагічных задач;
- паляпшэнне якасці падрыхтоўкі аркестравых музыкантаў.

Асаблівае значэнне пры падрыхтоўке студэнтаў да прафесійнай дзейнасці ў аркестры мае фарміраванне навыкаў чытання нот з ліста, якое абавязкова павінна мець штодзённую практыку.

Тэхнічнае забеспячэнне вучэбнай дысцыпліны «Вывучэнне аркестравага рэпертуара» кафедры мастацтва эстрады прадугледжвае наяўнасць у класе фартэпіяна, электронных клавішных інструментаў, ударнай установкі, а таксама гукаўзмацняльнай апаратуры для усіх інструментаў рытм-секцыі.

У камплект матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння таксама павінны ўваходзіць пульты для нот.

Важнымі складальнікамі поспехаў у рабоце па дысцыпліне з'яўляюцца стварэнне творчай атмасферы на занятках, імкненне да музычных эксперыментаў, добрае ўзаемаразуменне паміж выкладчыкам і студэнтамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.2 Вучэбныя пасобія

1. Гузий, В.М. Эуфониум (баритон): Пособие для музыкальных вузов по специальности "Инструментальное исполнительство: духовые и ударные инструменты" / В.М. Гузий – Ростов н/Д: Издательство РГК им. С.В. Рахманинова, 2010

2. Оркестровые трудности для скрипки / Сост. З. Кожарский. Вып. 1-3. Киев, 1972-1974. – 168 с.

3. Оркестровые трудности для скрипки : фрагм. из симф. произведений совет. композиторов / ред., сост. Е.Г. Бучинская, А.М. Панов Киев : Муз. Украина, 1989. – 103 с.

4. Оркестровые трудности из опер русских композиторов: Рукопись / Ред.-сост. Л.Горелик / Библиотека БГАМ. Мн., 1995.

5. A Prima Vista : учеб. пособие для чтения с листа на скрипке : для двух скрипок без сопровожд. / авт.-сост. Я. Рябинков ; вступ. ст. и метод. рек. сост. СПб : Грифон, 1994. -

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Змест аўдыторнай работы студэнтаў: практычная частка

Заняткі па вучэбнай дысцыпліне «Вывучэнне аркестравага рэпертуара» праводзяцца ў групавой форме на аснове паслядоўна распрацаванай праграмы навучання і абавязковых семестравых патрабаванняў.

Практычная частка аўдзіторнай работы складаецца з падбора рэпертуара, сумеснага вывучэння аркестравых твораў, тэхналогіі іх чытання з ліста, аналіза набытых аркестравых выканальніцкіх навыкаў і прафесійнага выканальніцкага ўзросту.

Падбор вучэбнага матэрыяла ў межах курса «Вывучэнне аркестравага рэпертуара» ажыццяўляецца па прынцыпу ад простага да складанага з улікам наяўнасці інструментаў сярод навучэнцаў і магчымасці аб'яднання іх у розныя склады, а таксама з улікам індывідуальных здольнасцей і тэхнічнай падрыхтоўкі большасці студэнтаў.

На працягу першых двух семестраў, як правіла, падбіраюцца найбольш вядомые і часцей за усё выконваемыя ў аркестравай практыцы музычныя творы розных стыляў і жанраў беларускіх і сусветных кампазітараў. У тым ліку творы, вывучаемыя і выконваемыя ў межах вучэбнай дысцыпліны «Аркестравы клас». За ўвесь час праходжання дысцыпліны студэнты павінны азнаёміцца з аркестравым рэпертуарам розных эпох і стыляў.

Абавязковым кампанентам навучання з'яўляецца арганізацыя і методыка самастойных заняткаў па вывучэнню аркестравага рэпертуара. Выкладчык павінен памятаваць аб тым, што ў час самастойных заняткаў адточваюцца навыкі выканальніцкай аркестравай тэхнікі і таму выхоўваць навыкі самастойнай работы, ўвесь час накіроўвая і кантралюя заняткі студэнтаў. Выкарыстанне ў аўдыторных і самастойных занятках апаратуры і электраабсталявання мяркуе наяўнасць студэнтамі ведаў аб правілах работы з імі, а таксама правілах тэхнікі бяспекі. Абавязковы інструктаж па якой праводзіцца сярод студэнтаў і выкладчыкаў у пачатку кожнага навучальнага года.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.2 Тэматыка практычных заняткаў для студэнтаў дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі (струнна-смычковыя інструменты):

1. Музычныя творы Венскай класічнай школы
2. Музычныя творы эпохі Рамантызм
3. Творы рускіх, савецкіх, беларускіх, замежных кампазітараў
4. Музычныя творы сучасных кампазітараў
5. Музычныя творы, напісаныя у сучасных танцавальных рытмах
6. Музычныя творы розных стыляў і жанраў для эстраднага аркестра.

## 3.3 Тэматыка практычных заняткаў для студэнтаў дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі (аркестравыя духавыя, ударныя інструменты, інструменты рытм-секцыі):

1. Музычныя творы, напісаныя у традыцыйных рытмах: марш, вальс, полька і іншыя
2. Музычныя творы, напісаныя ў жанрах “лаціна”, “рэггі”, “фьюжн”, “фанк” і іншых
3. Музычныя пьесы, напісаныя ў стыле і жанры “свінг”
4. Музычныя пьесы розных стыляў і жанраў для біг-бэнда
5. Музычныя творы, напісаныя у сучасных танцавальных рытмах
6. Музычныя пьесы розных стыляў і жанраў для эстраднага аркестра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.4 Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа – гэта форма індывідуальнай дзейнасці студэнтаў, накіроўванная на ўзмацненне пройдзенага матэрыяла, фарміраванне уменняў і навыкаў хутка вырашаць выканальніцкія задачы, творча асэнсоўваць матэрыял.

Самастойныя заняткі на інструменце павінны мець запланаваны і паслядоўны характар на працягу ўсяго часу навучання. Пры складанні заданняў самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Вывучэнне аркестравага рэпертуару» неабходна прадугледжваць узрастанне іх складанасці: ад заданняў, якія фарміруюць дастатковыя веды па вывучаным навучальным матэрыяле на ўзроўні пазнавання, да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўзнаўлення, і далей да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўжывання атрыманых ведаў.

Вялікая роля ў час самастойных заняткаў на інструменце адводзіцца такой форме работы як чытанне з ліста. Гэты навык дапамагае выпрацаваць у студэнтаў поўную прыгоднасць да прафесійнай дзейнасці ў любых умовах: ці то сольнае выкананне, ці то ансамблева-аркестравае.

Пры выкананні самастойнай работы студэнту неабходна мець на ўваге тэхнічныя і выразныя магчымасці музычных інструментаў, асаблівасці фактуры аркестравых твораў.

Асноўныя віды самастойнай работы па дысцыпліне «Вывучэнне аркестравага рэпертуару»:

-самастойная работа па аналізу вывучаемых аркестравых партый;

- набыццё навыкаў праглядвання наперад нотнага тэкста пры чытанні з ліста;

- набыццё навыкаў папярэдняга сальфеджыравання ўнутраным слыхам;

- набыццё навыкаў папярэдняга выбару выканальніцкіх штрыхоў і аплікатуры;

- выхаванне валявых якасцей;

- работа над памылкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для самастойнай кантраліруемай работы студэнтаў

1. Выкананне папярэдняга інструктыўнага матэрыялу (гамы, арпеджыа, храматычныя паслядоўнасці);
2. Азнакамленне з творчасцю, стылем кампазітараў, вывучаемых аркестравых твораў;
3. Асэнсаванне выканальніцкіх цяжкасцей;
4. Чытанне з ліста выканальніцкай літаратуры (напрыклад:
   - Дворжак А. Славянские танцы №2, №5 соч. 72
   - Глазунов А. Концертный вальс№2);
5. Работа з метраномам;

Узровень цяжкасці заданняў, іх паступовасць і паслядоўнасць кантралююцца выкладчыкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 Прыкладны спіс твораў для вывучэння студэнтамі дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі (струнна-смычковыя інструменты):

I курс 1-й семестр

1. Бах И.С Бранденбургский концерт № 3
2. Моцарт В.А. Увертюры к операм: «Свадьба Фигаро», «Дон Жуан»
3. Чайковский П.И. «Мазурка», «Вальс», «Полонез» из балета «Щелкунчик»
4. Бетховен Л. Симфония № 3
5. Россини Дж. Увертюра к опере «Сорока-воровка»
6. Вебер К.М. Увертюра к опере «Вольный стрелок»
7. Бетховен Л. Увертюра «Леонора» № 3

I курс 2-й семестр

1. Бетховен Л. Симфония № 5
2. Шуберт Ф. Симфонии № 7
3. Россини Дж. Увертюра к опере: «Севильский цирюльник»
4. Штраус И. Увертюры к опереттам: «Летучая мышь», «Цыганский барон»
5. Вагнер Р. Опера «Тристан и Изольда» 1 действие. 4 сцена
6. C.Parker Cool Blues
7. Э.Л.Уэббер Увертюра к мюзиклу Фантом в опере

II курс 3-й семестр

1. Вилла-Лобос Э. Бразильская бахиана № 1
2. Мендельсон Ф. Концерт для скрипки с оркестром e-moll
3. Брамс И. Венгерские танцы
4. Чайковский П. И. Симфония № 6
5. Рахманинов С. Концерт для фортепиано с оркестром № 3
6. Моцарт В.А. Симфония № 40
7. C.Corea Spain La Fiesta

II курс 4-й семестр

1. Гершвин Дж. Голубая рапсодия
2. Моцарт В.А. Дивертисмент F-dur
3. Чайковский П.И. Концерт для скрипки с оркестром D-dur
4. Штраус И. Польки
5. Дворжак А. Симфония № 9 («Из Нового света»)
6. L.Bonfa Black Orpheus

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. А.Сандовал Вечер в Гаване

III курс 5-й семестр

1. Мендельсон Ф. Музыка к драме «Сон в летнюю ночь»
2. Прокофьев С. Вальс из балета «Золушка»
3. Чайковский П.И. Серенада для струнного оркестра
4. Малер Г. Симфония № 5
5. Глебов Е.А. Фрагменты из балета «Маленький принц»
6. H.Mancini Peter Gunn

**4.3 Прыкладны спіс твораў для вывучэння студэнтамі дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі (аркестравыя духавыя, ударныя інструменты, інструменты рытм-секцыі):**

I курс 1-й семестр

1. N.Lane Admiral Horn
2. J.Sample Chain Reaction
3. S.Nestico Lost star
4. J.Ben Jor Mas Que Nada
5. J.Fedchock Midnight Passage
6. F.Steiner Perry Mason Theme
7. M.Ronson Uptown Funk

I курс 2-й семестр

1. C.Corea Spain La Fiesta
2. Incognito Don't You Worry
3. I.Krutoi Evridika-dance
4. L.Bonfa Black Orpheus
5. B.Reed Mack the Knife
6. S.Wonder Sir Duke

II курс 3-й семестр

1. C.Parker Cool Blues
2. D.Grusin & GRP All Star
3. N.Capocci Donut King
4. B.Strayhorn Take The A Train

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

II курс 4-й семестр

1. B.Sharp Havana Expressivo
2. H.Mancini Peter Gunn
3. Earth Wind And Fire September
4. H.Hancock Watermelon Man
5. Э.Л.Уэббер Увертюра к мюзиклу Фантом в опере
6. А.Сандовал Вечер в Гаване
7. П.Анка My way
8. A.Caron D-Code

III курс 5-й семестр

1. G.Goodwin There's the Rub
2. G.Goodwin Horn Of Puente
3. G.Goodwin Few Good Men
4. G.Goodwin Jazz police
5. G.Goodwin High Maintenance
6. G.Goodwin Mueva Los Huesos
7. G.Goodwin Sing Sang Sung

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.4 Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Кантроль вучэбнай дзейнасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Вывучэнне аркестравага рэпертуара» здзяйсняецца пры дапамозе наступных форм дыягностыкі:

- выкананне аркестравых твораў;
- абмеркаванне выканання, памылак і якасцей на занятках;
- асэнсаванне і абмеркаванне набытых навыкаў расстаноўкі аплікатуры і штрыхоў;
- аналіз і абмеркаванне відыазапісаў залікаў, экзаменаў, ці выступленняў студэнтаў;
- усе формы вучэбнага кантролю: экзамены, залікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.5 Крытэрыі адзнак вынікаў вучэбнай дзейнасці

10 (дзесяць). Вучэбны матэрыял выкананы на высокім прафесійным узроўні: адсутнасць памылак, пісьменнае прачытанне тэкстаў, яскравая штрыхавая тэхніка выканання, устойлівы метрарытм, стабільнае якаснае інтанаванне, стылявая кампетэнтнасць, эмацыянальная адпаведнасць выконваемаму твору.

9 (дзевяць). Вучэбны матэрыял выканан на высокім прафесійным узроўне: адсутнасць памылак, пісьменнае прачытанне тэкстаў, яскравая штрыхавая тэхніка выканання, устойлівы метрарытм, стабільнае якаснае інтанаванне, стылявая кампетэнтнасць.

8 (восем) Вучэбны матэрыял выканан на высокім прафесійным узроўне: адсутнасць памылак, яскравая штрыхавая тэхніка выканання, устойлівы метрарытм, стабільнае якаснае інтанаванне, стылявая кампетэнтнасць.

7 (сем). Вучэбны матэрыял выканан на добрым прафесійным узроўне: наяўнасць нязначных памылак, цікавая штрыхавая тэхніка выканання, устойлівы метрарытм, стабільнае інтанаванне, стылявая кампетэнтнасць.

6 (шэсць). Вучэбны матэрыял выканан на добрым прафесійным узроўне: наяўнасць нязначных памылак, цікавая штрыхавая тэхніка выканання, устойлівы метрарытм, добрае інтанаванне, адсутнасць стылявой кампетэнтнасці.

5 (пяць). Вучэбны матэрыял выканан на няпэўным прафесійным узроўне: наяўнасць значных памылак у тэксце, наяўнасць ведаў штрыхавой тэхнікі выканання, устойлівы метрарытм, сумленнае інтанаванне, прысутнасць стылявой кампетэнтнасці.

4 (чатыры). Вучэбны матэрыял выканан на няпэўным прафесійным узроўне: наяўнасць значных памылак у тэксце, адсутнасць штрыхавой тэхнікі выканання, неўстойлівы метрарытм, сумленнае інтанаванне, адсутнасць стылявой кампетэнтнасці.

3 (тры). Вучэбны матэрыял выканан на дрэнным прафесійным узроўне: наяўнасць значных памылак у тэксце, адсутнасць штрыхавой тэхнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выканання, няўстойлівы метрарытм, добрае інтанаванне, адсутнасць стылявой кампетэнтнасці.

2 (два). Вучэбны матэрыял выканан на дрэнным прафесійным узроўне: адсутнасць ведаў тэкстаў, адсутнасць штрыхавой тэхнікі выканання, адсутнасць метрарытма, дрэннае інтанаванне, адсутнасць стылявой кампетэнтнасці.

1 (адзін). Адказ студэнта ад выконвання праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Вучэбная праграма

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________________ Ю. П. Бондар
«____»______________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/баз.

**ВЫВУЧЭННЕ АРКЕСТРАВАГА РЭПЕРТУАРУ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-01*
*Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*М. В. Белова,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*С. Г. Горын,* старшы выкладчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*М. І. Берсан*, дацэнт кафедры аркестравага дырыжыравання ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», народны артыст Беларусі;
*А. Л. Капілаў*, рэктар прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 19.05.2014 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2014 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказныя за выпуск: М. В. Белова, С. Г. Горын

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Вывучэнне аркестравага рэпертуару» з'яўляецца важнейшай і неабходнай для студэнтаў, якія авалодваюць майстэрствам ігры ў аркестры, а таксама мае вялікае значэнне ў падрыхтоўцы да самастойнай прафесійнай дзейнасці. Знаёмства з рознымі тыпамі аркестраў, ансамбляў з шырокім дыяпазонам акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі, вывучэнне стылістычна і мастацка разнастайнай музычнай літаратуры садзейнічае ўсебаковаму развіццю музыкантаў.

*Галоўная мэта* вучэбнай дысцыпліны – набыццё ведаў аб працэсах, з'явах, тэндэнцыях развіцця сусветных і айчынных методык навучання аркестравай ігры і вывучэнне аркестравых партытур.

«Вывучэнне аркестравага рэпертуару» цесна ўзаемазвязана з такімі спецыяльнымі дысцыплінамі, як «Спецінструмент», «Інструментальны ансамбль», «Імправізацыя на спецінструменце», «Аркестравы клас», «Інструментазнаўства і інструментоўка», «Аранжыроўка і пералажэнне музычных твораў», «Дырыжыраванне», «Фартэпіяна», «Асновы джазавай імправізацыі».

У межах дысцыпліны «Вывучэнне аркестравага рэпертуару» прадугледжана выкананне наступных *задач:*

– фарміраванне прафесійнага інтарэсу да аркестравых традыцый і музычна-выканальніцкай культуры;

– развіццё ўстойлівай базы навыкаў для вырашэння шырокага дыяпазону мастацкіх і тэхналагічных задач;

– набыццё ўменняў рацыянальна арганізоўваць заняткі, засвойваць матэрыял і фарміраваць рэпертуар;

– паляпшэнне якасці падрыхтоўкі аркестравых музыкантаў.

Працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацтва эстрады накіраваны на авалоданне студэнтамі ведамі і ўменнямі, якія дазволяць на высокім узроўні вырашаць прафесійныя задачы ў далейшай творчай і педагагічнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– спецыфіку выкладання спецыяльных дысцыплін у розных тыпах навучальных устаноў (УВА, сну), у дзіцячых і дарослых аматарскіх калектывах;

– методыку складання і аналіз вучэбнага рэпертуару, канцэртных музычных праграм;

– методыку работы над музычным творам на розных этапах работы;

– сучасную метадычную літаратуру;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

– выкладаць музычныя дысцыпліны ў прафесійных і агульных установах музычнай адукацыі;

– выкарыстоўваць у вучэбным працэсе сучасныя методыкі;

– працаваць з вучэбна-метадычнай літаратурай;

– вырашаць мастацкія і тэхнічныя задачы музычнага твора;

*валодаць:*

– першапачатковымі прынцыпамі і асаблівасцямі вывучэння аркестравага рэпертуару:

– устойлівымі навыкамі выканання аркестравых партый, а таксама транспазіцыі партый з клавіра.

Пры выкладанні дадзенай дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя тэхналогіі навучання: інфармацыйныя, эўрыстычныя, эмацыянальна-мастацкія, асобасна арыентацыйныя, творчыя, камп'ютарнае навучанне.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Вывучэнне аркестравага рэпертуару» ўсяго прадугледжана 208 гадзін, з якіх 82 гадзіны – аўдыторныя (практычныя) заняткі.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных (практычных) гадзін |
|---|---|
| Уводзіны | 1 |
| **Раздзел I. Агульныя элементы музычнага выканальніцтва** | **22** |
| Тэма 1. Агульныя прынцыпы настройкі аркестравых інструментаў | |
| Тэма 2. Метр і рытм як элементы музычнага выканальніцтва | |
| Тэма 3. Сродкі музычнага выканальніцтва: дынаміка, тэмбр | |
| Тэма 4. Тэмп і яго змяненні (агогіка) | |
| Тэма 5. Фразіроўка | |
| **Раздзел II. Музычна-выкана[illegible] тэхніка** | **26** |
| Тэма 6. Прыёмы гуказдабыва[illegible]ычных інструментах | |
| Тэма 7. Аплікатура і яе магчымасці | |
| Тэма 8. Прынцыпы інтанавання на розных музычных інструментах | |
| Тэма 9. Штрыхі, іх класіфікацыя, метады выканання | |
| **Раздзел III. Фарміраванне асноў выканальніцкага майстэрства і вучэбны рэпертуар** | **25** |
| Тэма 10. Інструктыўны матэрыял (вывучэнне аркестравых цяжкасцей) | |
| Тэма 11. Вывучэнне твораў буйной формы (сімфоніі, мюзіклы, аркестравыя сюіты і г.д.) | |
| Тэма 12. Творы малой формы (музычныя п’есы, мініяцюры і г.д.) | |
| Тэма 13. Тэхніка чытання нот з ліста | |
| **Раздзел IV. Асаблівасці выканання розных музычных стыляў і жанраў** | **8** |
| Тэма 14. Аналіз аркестравых стыляў | |
| Тэма 15. Асаблівасці выканання музыкі розных эпох | |
| **Усяго…** | **82** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Уводзіны*

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Узаемасувязь дысцыпліны «Вывучэнне аркестравага рэпертуару» з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны. Тыпы і віды аркестраў і ансамбляў. Малыя, сярэднія, вялікія склады аркестра. Аркестрацечнасць ансамблевай і аркестравай партытуры. Адаптацыя ансамблевай і аркестравай партытуры па складанасці да тэхнічнага ўзроўню выканаўцаў ансамбля ці аркестра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Раздзел I. Агульныя элементы музычнага выканальніцтва

#### *Тэма 1. Агульныя прынцыпы настройкі аркестравых інструментаў*

Індывідуальная настройка інструментаў выканальнікамі па асноўных групах (струнныя інструменты, духавыя інструменты, інструменты рытм-групы). Прывядзенне асобных груп да ўнісону па зададзенай вышыні. Настройка аркестравых груп. Злучэнне ўнісону груп у агульнааркестравы ўнісон (па асноўных групах). Выкананне інтэрвалаў – чыстых квінтаў, актаў, мажорных і мінорных акордаў па гарманічнай вертыкалі (духавая група).

#### *Тэма 2. Метр і рытм як элементы музычнага выканальніцтва*

Роля рытму ў працоўных працэсах і мастацкай творчасці. Рытм і ўпарадкаванае расчляненне рухаў у часавых адносінах. Формаўтваральнае значэнне рытму і яго сувязь з асаблівасцямі і характарам музычнага твора. Развіццё рытмічнага пачуцця. Аналіз метрарытмічнай структуры выконваемага музычнага твора як важнейшая ўмова развіцця рытмічнага пачуцця ў студэнта. Значэнне актыўнага слыхавога кантролю.

Метр як мера рытму, тэмп як хуткасць чаргавання метрычных долей. Вызначэнне метра і тэмпу ў нотным тэксце. Выразнае значэнне паўз.

#### *Тэма 3. Сродкі музычнага выканальніцтва: дынаміка, тэмбр*

Дынаміка як адзін з асноўных элементаў музычнай выразнасці.

Значэнне выхавання дыферэнцыраваных адчуванняў сілы гуку і паступовага яго змянення. Неабходнасць слыхавога кантролю за гукам на ўсёй яго працягласці. Паняцце аб асноўных дынамічных адценнях. Асноўныя віды дынамічных акцэнтаў, іх мастацкае выкарыстоўванне. Дынамічныя кантрасты. Шумы і музычныя гукі. Розныя адценні і тэмбры гукаў, іх уплыў на слых. Вывучэнне ўсіх рэгістраў і тэмбраў інструмента. Дынаміка гуку.

*Тэма 4. Тэмп і яго змяненні (агогіка)*

Тэмп як сродак выразнасці. Агогіка. Змены тэмпу і агогіка. Метраном. Паскарэнне і запаволенне тэмпу, раптоўная змена тэмпу. Тэмп: форма твора.

Абазначэнне тэмпаў з дапамогай умоўных знакаў або спецыяльных тэрмінаў. Індывідуальнасць тэмпавага выканання. Адзінства тэмпу і магчымасці адхілення ад яго. Правільны тэмп як сродак раскрыцця мастацкага зместу музычнага твора. Адсутнасць сувязі тэмпу з дынамічнымі змяненнямі. Агогіка – адхіленне ад асноўнага тэмпу і рытму, абумоўленае жывым, творчым характарам усяго выканальніцкага працэсу. Кульмінацыйныя ўзлёты і спады. Мастацкая выканальніцкая сталасць і правільны выбар тэмпаў.

*Тэма 5. Фразіроўка*

Мелодыя, яе вядучае значэнне ў музычным творы, работа над ёй. Значэнне аналізу структуры музычнай фразы для правільнага чытання нотнага тэксту і раскрыцця зместу музычнага твора. Вызначэнне музычных фраз пры выкананні музычных твораў. Мастацкія сродкі фразіроўкі. Абавязковае захаванне аўтарскіх указанняў у нотным тэксце як адна з асноў мастацтва інтэрпрэтацыі. Неразрыўная сувязь розных музычных знакаў з музычнай думкай – фразай.

**Раздзел ІІ. Музычна-выканальніцкая тэхніка**

*Тэма 6. Прыёмы гуказдабывання*
*на музычных інструментах*

Гук – як матэрыяльная аснова музыкі. Комплекс якасных выразных асаблівасцей гуку: устойлівасць, пявучасць, тэмбральная насычанасць. Адпаведнасць гэтым крытэрыям якасці гуку асноўным аркестравым групам. Якасць гуку і тэмбр, тэмбральная палітра аркестра. Культура гуку і сродкі музычнай выразнасці. Тэхніка выканання. Якасць музычнага інструментарыя аркестра, гукаўзмацняльнай апаратуры.

Гукавая дынаміка. Тэмбравае афарбоўванне гуку. Слыхавы кантроль

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

над гуказдабываннем.

*Тэма 7. Аплікатура і яе магчымасці*

Аплікатура як сродак мастацкай выразнасці і як тэхнічны сродак. Прынцыпы падбору аплікатуры, сувязь з метрам і рытмам. Індывідуальная аплікатура. Сувязь аплікатуры з інтанацыяй, дынамікай. Віды аплікатуры. Выкарыстанне пазіцый і паўпазіцый, міжпазіцыйная ігра. Аплікатурныя мадэлі. Эвалюцыя аплікатурных сістэм. Аналіз аплікатуры ў розных выданнях і метадычных дапаможніках.

*Тэма 8. Прынцыпы інтанавання*
*на розных музычных інструментах*

Інтанаванне – неабходная ўмова выканання, сродак мастацкай выразнасці. Паняцце дакладнай інтанацыі ў музычна-мастацкім і акустычным сэнсе. Натуральны гукарад і тэмпераваны строй. Сувязь інтанацыі і стылю выконваемай музыкі. Вучэнне аб зоннай прыродзе слыхавых успрыманняў (М. Гарбузаў). Праблемы інтанавання на інструментах з нефіксаваным строем. Работа над інтанацыяй у мастацкім і тэхнічным плане. Найбольш характэрныя памылкі інтанавання, метады іх выпраўлення. Роля слыху, які кіруе інтанацыяй і кантралюе яе.

*Тэма 9. Штрыхі, іх класіфікацыя, метады выканання*

Асноўныя віды штрыхоў і іх значэнне як сродкаў музычна-мастацкай выразнасці. Тэхніка плаўных штрыхоў: дэташэ, легата; прынцыпы мастацкага выкарыстоўвання гэтых штрыхоў. Адрывістыя штрыхі: мартэле, стаката, тэхніка іх выканання. Скачучыя штрыхі: спіката, саціе, лятучае стаката, рыкашэт. Змешаныя штрыхі. Дэкламацыйна-выразная сутнасць штрыхоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Фарміраванне асноў выканальніцкага майстэрства і вучэбны рэпертуар

*Тэма 10. Інструктыўны матэрыял*
*(вывучэнне аркестравых цяжкасцей)*

Асаблівасці і змест работы з інструктыўным матэрыялам. Асноўныя этапы работы: азнаямленне з музычным творам, стылістычныя асаблівасці твора, змест і форма, вызначэнне выканальніцкіх цяжкасцей. Вызначэнне характару цяжкасцей, метадаў работы над імі. Работа над пэўнымі фрагментамі, закончанымі часткамі і цэлым мастацкім творам.

*Тэма 11. Вывучэнне твораў буйной формы*
*(сімфоніі, мюзіклы, аркестравыя сюіты і г. д.)*

Асаблівасці і змест работы ў розныя перыяды вывучэння музычных твораў. Спецыфіка выканання буйной аркестравай формы. Асноўныя этапы работы: агульнае азнаямленне, стылістычная сутнасць, змест і форма. Работа над удасканальваннем тэхнічнага боку твораў і мастацкай апрацоўкай дэталей. Выбар выканальніцкіх сродкаў выразнасці, якія адпавядаюць зместу вывучаемага твора. Работа над пэўнымі фрагментамі, закончанымі часткамі і цэлым мастацкім творам.

*Тэма 12. Творы малой формы*
*(музычныя п'есы, мініяцюры і г. д.)*

Неабходнасць выканання п'ес малой аркестравай формы ў працэсе навучання. Абавязковае вывучэнне твораў кампазітараў розных стыляў і эпох для выхавання пачуцця стылю і адчування характару музыкі, азнаямленне з шырокім кругам класічнай і сучаснай аркестравай літаратуры малой формы. Спецыфіка яе выканання. Выхаванне выканальніцкай волі. Накапленне рэпертуару як форма падрыхтоўкі студэнта да практычнай аркестравай дзейнасці. Работа над творамі поліфанічнага складу, іх значэнне ў тэхнічным і музычным станаўленні выканаўцы.

*Тэма 13. Тэхніка чытання нот з ліста*

Чытанне нот з ліста як фактар, што развівае выканальніцкія навыкі. Умовы паступовага ўскладнення чытаемага нотнага матэрыялу. Прынцыпы чыткі і іх значэнне для прафесійнага станаўлення музыканта. Хуткасць чытання з ліста. Выхаванне агульнааркестравай уважлівасці. Транспанаванне.

## Раздзел IV. Асаблівасці выканання розных музычных стыляў і жанраў

*Тэма 14. Аналіз аркестравых стыляў*

Вывучэнне аркестравай літаратуры. Аналіз сродкаў музычнай выразнасці розных музычных стыляў. Агульныя прынцыпы музычнай эстэтыкі, іх прымяненне да інтэрпрэтацыі музычных твораў. Узнаўленне ў выкананні характэрных рыс музычнага стылю. Мнагазначнасць паняцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«музычны стыль».

*Тэма 15. Асаблівасці выканання музыкі розных эпох*

Музыка эпох: барока, класіцызму, рамантызму, сучасных беларускіх кампазітараў. Вывучэнне манеры пісьма, асаблівасцей формы, фактуры музычнага твора, яго прыналежнасці да таго або іншага жанру. Нацыянальны каларыт. Спасціжэнне сутнасці самых розных мастацкіх напрамкаў, набыццё ўмення перадаваць іх характэрныя асаблівасці. Неабходнасць навучання ігры ў розных жанрах. Роля інтуіцыі ў выканальніцкім працэсе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. Оркестровые трудности : для скрипки. Вып. 1 : Балеты / сост.: З. Кожарский и П. Червинский. – Київ : Музична Україна, 1972. – 164 с.

2. Оркестровые трудности : для скрипки. Вып. 2 : Оперы / сост.: З. Кожарский и П. Червинский. – Київ : Музична Україна, 1973. – 167 с.

3. Оркестровые трудности : для скрипки. Вып. 3 : Симфонические произведения / сост. З. Кожарский. – Київ : Музична Україна, 1974. – 160 с.

4. Оркестровые трудности для скрипки / ред.-сост.: Е. Бучинская, А. Панов. – Київ : Музична Україна, 1989. – 90 с.

5. Оркестровые трудности из опер русских композиторов: Рукопись / ред.-сост. Л. Горелик / Библиотека БГАМ. – Минск, 1995.

*6. Первенков, В. Г.* Акустика и настройка музыкальных инструментов [Текст] / В. Г. Первенков. – М. : Музыка, 1990. – 142 с.

*7. Рогаль-Левицкий, Д. Р.* Современный оркестр [Текст] / Д. Р. Рогаль-Левицкий. – М. : Музыка, 1953. – 80 с.

*8. Сидельников, Л. С.* Большой симфонический оркестр Центрального телевидения и Всесоюзного радио [Текст] / Л. С. Сидельников. – М. : Музыка, 1981. – 120 с.

*Дадатковая*

*1. Агафонников, Н. Н.* Симфоническая партитура [Текст] / Н. Н. Агафонников. – Л. : Музыка. 1981. – 220 с.

*2. Гинзбург, С. Л.* Что нужно знать о симфоническом оркестре [Текст] / С. Л. Гинзбург. – Л. : Музыка, 1967. – 140 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

Пры складанні заданняў самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Вывучэнне аркестравага рэпертуару» неабходна прадугледзець узрастанне іх складанасці: ад заданняў, якія фарміруюць дастатковыя веды па вывучаным навучальным матэрыяле на ўзроўні пазнавання, да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўзнаўлення, і далей да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўжывання атрыманых ведаў.

Пры выкананні самастойнай работы студэнту неабходна асобную ўвагу звярнуць на дыяпазоны музычных інструментаў, іх тэхнічныя і выразныя магчымасці, асаблівасці фактуры музычных твораў.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

1) вуснае апытанне;
2) правядзенне тэхнічных залікаў;
3) кантрольныя заданні;
4) залік;
5) экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ВЫВУЧЭННЕ АРКЕСТРАВАГА РЭПЕРТУАРУ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-01*
*Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. Д. Захарэвіч

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,76. Ул.-выд. арк. 0,41. Тыраж экз. Заказ

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: дзённая форма атрымання адукацыі

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | практычныя | КСР | |
| Уводзіны ў дысцыпліну | 1 | 1 | | |
| **Раздзел I. Агульныя веды аркестравага выканальніцтва** | | | | |
| *Тэма 1.* Прынцыпы настройкі інструментаў у аркестры | 1 | 1 | | |
| *Тэма 2.* Метрарытм | 4 | 4 | | |
| *Тэма 3.* Тэхніка чытання нот з ліста | 4 | 4 | | |
| *Тэма 4.* Псіхалагічны настрой | 2 | 2 | | |
| **Раздзел II. Музычна-выканальніцкая тэхніка** | | | | |
| *Тэма 5.* Асаблівасці ігры ў ансамблі | 2 | 2 | | |
| *Тэма 6.* Інтанаванне, гуказдабыванне, вібрата, аплікатура, дынаміка | 5 | 5 | | |
| *Тэма 7.* Асобыя прыёмы ігры на інструменце ў аркестры | 3 | 3 | | Кантрольны урок |
| **Раздзел III. Вучэбны рэпертуар** | | | | |
| *Тэма 8.* Творы буйной формы (сімфоніі, мюзіклы, канцэрты, аркестравыя сюіты і г.д.) | 20 | 10 | 10 | |
| *Тэма 9.* Творы малой формы (уверцюры, канцэртныя нумары, дывертысменты і г.д.) | 20 | 10 | 10 | |
| *Тэма 10.* Інструктыўны матэрыял (аркестравыя цяжкасці) | 10 | 10 | | Кантрольны урок |
| **Раздзел IV. Асаблівасці выканання музыкі розных стыляў і жанраў** | | | | |
| *Тэма 11.* Штрыхавыя асаблівасці ў розных стылях акадэмічнай і джазавай музыкі | 3 | 3 | | |
| *Тэма 12.* Аналіз аркестравых стыляў | 5 | 5 | | |
| *Тэма 13.* Асаблівасці нотазапісу | 2 | 2 | | |
| **Усяго…** | **82** | **62** | **20** | **Залік, экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.3 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: завочная форма атрымання адукацыі

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|
| | усяго | практычныя заняткі | |
| Уводзіны ў дысцыпліну | 1 | 0.5 | |
| **Раздзел I. Агульныя веды аркестравага выканальніцтва** | | | |
| *Тэма 1.* Прынцыпы настройкі інструментаў у аркестры | 1 | 0.5 | |
| *Тэма 2.* Метрарытм | 4 | 1 | |
| *Тэма 3.* Тэхніка чытання нот з ліста | 4 | 0.5 | |
| *Тэма 4.* Псіхалагічны настрой | 2 | 0.5 | |
| **Раздзел II. Музычна-выканальніцкая тэхніка** | | | |
| *Тэма 5.* Асаблівасці ігры ў ансамблі | 2 | 0.5 | |
| *Тэма 6.* Інтанаванне, гуказдабыванне, вібрата, аплікатура, дынаміка | 5 | 2 | |
| *Тэма 7.* Асобыя прыёмы ігры на інструменце ў аркестры | 3 | 1 | |
| **Раздзел III. Вучэбны рэпертуар** | | | |
| *Тэма 8.* Творы буйной формы (сімфоніі, мюзіклы, канцэрты, аркестравыя сюіты і г.д.) | 20 | 10 | |
| *Тэма 9.* Творы малой формы (уверцюры, канцэртныя нумары, дывертысменты і г.д.) | 20 | 5 | |
| *Тэма 10.* Інструктыўны матэрыял (аркестравыя цяжкасці) | 10 | 2 | |
| **Раздзел IV. Асаблівасці выканання музыкі розных стыляў і жанраў** | | | |
| *Тэма 11.* Штрыхавыя асаблівасці ў розных стылях акадэмічнай і джазавай музыкі | 3 | 1 | |
| *Тэма 12.* Аналіз аркестравых стыляў | 5 | 1 | |
| *Тэма 13.* Асаблівасці нотазапісу | 2 | 0.5 | |
| **Усяго…** | **82** | **26** | **Залік, экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4 Асноўная літаратура

1. *Агафонников, Н. Н.* Симфоническая партитура [Текст] / Н. Н. Агафонников. – Л. : Музыка. 1981. – 220 с.

2. *Гинзбург, С. Л.* Что нужно знать о симфоническом оркестре [Текст] / С. Л. Гинзбург. – Л. : Музыка, 1967. – 140 с.

3. *Верхолаз, Р.* Вопросы методики чтения нот с листа / Р.Верхолаз. – М.: Музыка, 1969. – 140 с.

4. *Кузнецов, Л.А.* Акустика музыкальных инструментов : справочник / Л. А. Кузнецов. – М. : Легпромбытиздат, 1989. – 368 с. : ил.

5. *Мазель, Л.* Строение музыкальных произведений / Л.Мазель. – М.: Музыка, 1979. – 77 с.

6. *Первенков, В. Г.* Акустика и настройка музыкальных инструментов [Текст] / В. Г. Первенков. – М. : Музыка, 1990. – 142 с.

7. *Переверзев, Н.* Исполнительская интонация / Н.Переверзев. – М.: Музыка, 1989. – 53 с.

8. *Свечков, Д.* Духовой оркестр / Д. Свечков. – М.: Музыка, 1968. –

9. *Сидельников, Л. С.* Большой симфонический оркестр Центрального телевидения и Всесоюзного радио [Текст] / Л. С. Сидельников. – М. : Музыка, 1981. – 120 с.

10. *Сидельников, Л.* Симфоническое исполнительство / Л.Сидельников. – М.: Советский композитор, 1991. – 283 с.

11. *Рогаль-Левицкий, Д. Р.* Современный оркестр [Текст] / Д. Р. Рогаль-Левицкий. – М. : Музыка, 1953. – 80 с.

12. *12.Харитонов, А.Е.* Звукоизвлечение на медных духовых инструментах как артикуляционно-штриховой феномен / А.Е. Харитонов. – М. : Водолей, 2010. – 144 с.

## 5.5 Дадатковая літаратура

1. *Барсова, И.А.* Книга об оркестре 2-е изд./ И.А. Барсова. – М.: Музыка, 1978

2. *Гинсбург, С.* Что нужно знать о симфоническом оркестре / С. Гинзбург – Ленинград : Сов. композитор, 1959. – 75 с., 1 л. ил. : ил.

3. *Понятовский, С.П.* Персимфанс – оркестр без дирижера / С.П. Понятовский. – М.: Музыка, 2003 – 192 с.

4. *Хасанова, В.* Музыкальный ритм / В.Хасанова – М.: Музыка, 1980. – 50 с.

5. *Ширинский, А.* Штриховая техника скрипача / А. Ширинский – М. : Музыка,1983. – с. 87.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ